

Ахова птушак Бацькаўшчыны

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ



www.ptushki.org

№ 4(43) - 2010

Уважаемые друзья!



Прошло уже 12 лет с момента создания АПБ. По восточному календарю завершается один полный двенадцатилетний цикл и начинается новый. Этот период был очень интересным и насыщенным в жизни организации. АПБ выросла из молодой структуры в активнейшую природоохранную общественную организацию страны, крупнейшее сообщество людей, движимых общей целью сохранения природы Беларуси.

Подчеркивая значимость сохранения биоразнообразия для выживания Планеты, ООН объявило уходящий год «Годом биологического разнообразия». К этой дате на разных уровнях специально были приурочены различные программы, проекты и мероприятия. Год уходит, но для АПБ, как и для других природоохранных организаций и структур, каждый последующий год будет Годом биоразнообразия.

С каждым годом нагрузка на окружающую среду со стороны человека увеличивается. И наша страна, как бы нам этого не хотелось, не является исключением из этого глобального процесса. Такое развитие ситуации требует объединения усилий государственных органов, негосударственных структур и жителей страны.

Мы гордимся уровнем взаимодействия с центральными органами управления природными ресурсами, а также их региональными структурами – комитетами, инспекциями и лесхозами. Мы верим, что только эффективное взаимодействие между госструктурами и общественностью может дать действительно значимый результат. Мы высоко ценим тот уровень общественной поддержки, который АПБ смогла достичь. Только те результаты и действия, которые разделяются обществом в целом и поддержаны местными сообществами, могут быть устойчивыми.

В следующем году «Год биологического разнообразия» передает эстафету «Году леса». Для страны, почти половина которой покрыта лесами, это отличная возможность и дальше продвигать вопросы сохранения биологического разнообразия и развивать взаимодействие на всех уровнях.

В 2010 году истекает срок моих полномочий как Председателя АПБ. Мне было очень приятно занимать это почетный и ответственный пост на протяжении шести последних лет – максимально возможного срока по Уставу АПБ.

Мне особо хочется отметить работу директора Виктора Фенчука, а также профессионализм и ответственность главного бухгалтера Анны Колесниковой. Я с теплотой буду вспоминать всех сотрудников офиса АПБ, так много сделавших для развития и становление нашей организации. Мне также приятно будет передать организацию в руки нового Председателя, который будет избран на очередном Съезде АПБ. На сегодняшний день АПБ – крупнейшая и наиболее активная общественная природоохранная организация Беларуси. Это наше с вами достижение и наша с вами гордость. Я уверен, что и в дальнейшем АПБ сможет рассчитывать на поддержку своих сторонников и будет активно и динамично развиваться.

С Новым годом и Рождеством! Пусть в вашем доме всегда будет радость. Вместе для птиц и людей!

Владимир Ивановский, председатель АПБ

Проектные будни – взгляд изнутри



Слева направо: Татьяна Ярмощук, Татьяна Броска, Надежда Лещинская. Фото А.Тиле

Девушки в высоких резиновых сапогах хлюпают восемь километров по самому крупному болоту на северо-западе Беларуси. Кто они такие? Анет Тиле – ландшафтный эколог по специальности, приехала в Беларусь на три года, для того чтобы вместе с другими молодыми учеными работать в группе АПБ по исследованию торфяников и их восстановлению. Надя Лещинская – биолог по специальности, работает по данной тематике.

Зачем они изучают белорусские болота? Потому что установлено: по всему миру болота выделяют в атмосферу парниковые газы (ПГ) (в Беларуси около 15 Мт в год), которые оказывают влияние на климат. Приблизительно 10% из всех антропогенных выбросов ПГ (парниковых газов) приходится на нарушенные болота!

И как это оценить? Можно постоянно находиться на болоте и измерять эмиссии, но это дорого и невозможно для почти трех миллионов гектаров болот по всей Беларуси.

Очевидно, что нужны индикаторы, которые помогут оценить эмиссии ПГ. В ходе исследований учеными из университета Грейфсвальд (Германия) было выяснено, что в зависимости от уровня грунтовых вод активируются разные биохимические реакции, в результате которых образуется разное количество CO_2, N_2O (закись азота) либо CH_4 (метан). Чем выше уровень воды к поверхности почвы, тем меньше выделяется CO_2 и N_2O. Если вода находится на глубине 15 см и ниже под поверхностью почвы, то начинается выброс закиси азота. Если уровень воды над поверхностью почвы составляет 20 см и выше, то начинает интенсивно выделяться метан. Значит, уровень грунтовых вод (УГВ) может быть индикатором для выбросов ПГ.

Еще известно, что состав растительности показывает колебания УГВ в течение года. Так как у каждого растения есть экологическая ниша, характерные для него условия обитания, то совокупность растений со схожими условиями показывает довольно точно колебания уровня воды в течение года.

(продолжение читайте на стр.7)

Навіны аддзяленняў

Сімвал Віцебска



Малюнак Антона Шчэрбіка, супрацоўніка Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, сябра АПБ

15 сакавіка 2010 г. Віцебскім гарадскім аддзяленнем АПБ у межах рэалізацыі міні-праекта "Птушка – сімвал Віцебска" быў абвяўлены аднайменны конкурс, і 15 лістапада завяршыўся прыём матэрыялаў ад яго ўдзельнікаў. На конкурс паступілі пераважна малюнкі вучняў школ горада і студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па выніках аналізу малюнкаў і апытанняў, арніталагічным сімвалам Віцебска прызнана кольчатая туркаўка (Streptopelia decaocto, кольчатая горлица, горлинка (устар.)).

Даведка: кольчатая туркаўка адносіцца да сямейства галубіных. Даўжыня яе цела складае 28–30 см. Галава, шыя і грудка маюць ружаватае адценне, спіна буравата-шэрая, на шыі дарослых птушак ёсць чорнае, аточанае белым паўкольца. Хвост шырокі з белай паласой. Клюў цёмны, ногі пурпуровага колеру. Гэта аседлая птушка абітае выключна ў населеных пунктах, аддае перавагу старым паркам і скверам з добра развітымі, высакаствольнымі дрэвамі.

Зараз праводзіцца падрыхтоўка конкурсных работ да выставы. Гэта ўключае ў тым ліку выданне календароў і закладак з выявамі кольчатай туркаўкі і конкурсных малюнкаў. Пераможцы конкурса атрымаюць прызы. Адным з вынікаў усёй працы стане прэзентацыя "Кольчатая туркаўка – сімвал Віцебска". Яе прадстаўленне адбудзецца ў школах Віцебска і дазволіць зацікавіць і прыцягнуць у шэрагі арганізацыі новых сяброў.

Галіна Захарава, старшыня Віцебскага аддзялення

Семінар на стыку пакаленняў: погляд удзельніка



Удзельнікі семінара распрацоўваюць ідэю новага праекта. Фота К.Чарнак

У канцы кастрычніка мне патэлефанаваў Дзьмітры Вінчэўскі і прапанаваў паўдзельнічаць 6–7 лістапада ў семінары, дзе збяруцца "старыя і новыя студэнты" з усёй Беларусі. Я згадзіўся, з сумам падумаўшы, да якой групы я адношуся. Галоўнымі мэтамі семінара, які адбыўся непадалёк ад Гродна, было даць базавыя навыкі па арганізацыі груп і рабоце ў іх, абмеркаваць вынікі міні-праектаў, якія адбыліся ў гэтым годзе, а таксама выпрацаваць ідэі для наступнага года, ну і, вядома ж, пазнаёміць актыўных студэнтаў паміж сабой – разам для птушак і людзей!

Той, хто раней прымаў удзел у падобных семінарах, ведаў, што нас чакала цікавая і вельмі насычаная работа. Так у выніку і адбылося. На жаль, далёка не ўсе "дзяды" дабраліся да семінара (ці то пенсію каму затрымалі, ці то ўзрост ужо не той). Так што ўдалося абмеркаваць вынікі толькі трох праектаў ("Усталяванне штучных гняздоўяў для пустальгі", Юлія Трацьяк, Баранавічы; "Улік соў у Гродненскім раёне", Дзяніс Табуноў, Гродна; "Онлайн-трансляцыя з гнёздаў пустальгі" Яўген Сліж, Гродна). Затое навічкі выкарысталі атрыманыя веды ў некалькіх цікавых ідэях, якія, спадзяюся, стануць не менш цікавымі праектамі. Хацелася б выразіць удзячнасць Дзмітрыю і Алене Вінчэўскім, а таксама ўсім арганізатарам і ўдзельнікам семінара. Да новых сустрэч!

Дзяніс Табуноў, сябра Гродненскага аддзялення АПБ

Інвентарызацыя векавых і ўнікальных дрэў на тэрыторыі Шумілінскага раёна



Школьнікі мераюць шырыню дрэва. Фота М.Алексеенка

Шумілінскае аддзяленне АПБ рэалізавала праект "Інвентарызацыя векавых і ўнікальных дрэў на тэрыторыі раёна". У рэалізацыі праекта прынялі ўдзел школы Шумілінскага раёна. Асабліва актыўнымі і прадуктыўнымі былі: Шумілінская раённая гімназія, Мішкаўская СШ, Мішневіцкая СШ, Башнёўская СШ, Крывасельская д/с-СШ Гарадоцкага раёна.

Усяго было знойдзена і апісана каля 100 дрэў: 34 асобна размешчаныя дрэвы і 2 прысады (больш за 60 дрэў). Былі знойдзены 24 дубы, што маюць на вышыні 1,3 метры ад зямлі абхват больш за 3м. Самы вялікі дуб (абхват 5,5 м) быў знойдзены даследчыкамі Мішневіцкай СШ. Ліп усяго выяўлена 17. Самую вялікую ліпу (5,7 м) знайшлі даследчыкі Лаўжанскай школы. Самая буйная вярба (5,5 м) апісана даследчыкамі Крывасельскай школы. У скарбонцы векавых дрэў ёсць яшчэ і сосны, і клёны, і таполі. Сярод унікальных дрэў – кедр, асіна, клён і сасна.

Зараз абагульненыя вынікі працы рыхтуюцца да выдання ў брашуры "Векавыя і ўнікальныя дрэвы Шуміліншчыны". У адносінах да пяці аб'ектаў (паводле даследаванняў Суровенскай БШ) Шумілінскім РВК было прынята рашэнне аб рэгістрацыі помнікаў прыроды мясцовага значэння. Праца ў гэтым накірунку працягваецца. Ёсць відавочная неабходнасць у правядзенні падобных даследаванняў у межах усёй рэспублікі.

Зязюлька Галіна, сябра Шумілінскага раённага аддзялення АПБ

Навіны праектаў

Зялёныя школы ў Беларусі

З лета 2010 г. наша арганізацыя далучылася да рэалізацыі праекта "Павышэнне экалагічнай інфармаванасці моладзі праз засвоенне і развіццё Зялёных школ у Беларусі". Ён праходзіць пры фінансавай падтрымцы ЕС, Прадстаўніцтва ААН у РБ, пры падтрымцы Міністэрства адукацыі РБ. Праект ахоплівае 217 школ і экалагічных цэнтраў па ўсёй Беларусі.

За кароткі адрэзак часу былі распрацаваны разнастайныя метадычныя матэрыялы, такія як "Метадычныя рэкамендацыі па стварэнню экалагічных адукацыйных пунктаў на асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях", "Метадычныя рэкамендацыі па правядзенню заняткаў у межах факультатыва "Дзікая прырода Беларусі" і праграмы "Зялёныя школы ў Беларусі", "Маніторынг элементаў дзікай прыроды для школьнікаў: падрыхтоўка, методыкі і прадстаўленне вынікаў". У распрацоўцы вышэйпералічаных матэрыялаў прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты ў галіне экалогіі і аховы прыроды.

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на блок практычных трэнінгаў, якія адбыліся на базе ДПУ "Бярэзінскі біясферны запаведнік" увосень 2010 г. У трэнінгах прыняло ўдзел



Настаўнікі вывучаюць біяразнастайнасць вадаёма. Фота В.Лукшыц

больш за 100 прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў адукацыі з усёй Беларусі, а таксама прадстаўнікі Міністэрства адукацыі РБ, Нацыянальнага інстытута адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Удзельнікі трэнінгаў удасканалілі свае навыкі правядзення экалагічных заняткаў і экскурсій на прышкольным участку, пазнаёміліся з магчымымі накірункамі дзейнасці школ па ахове дзікай прыроды, а таксама навучыліся выкарыстоўваць экалагічныя гульні у сваёй адукацыйнай дзейнасці.


Дадатковая інфармацыя на сайце www.ecorazvitie.by.

Надзея Ляйчонак, мэнэджар праекта

Лясны праект АПБ

У пачатку 2011 года завяршаецца праца па праекце "Забеспячэнне захавання і ўстойлівага кіравання біялагічна значнымі лясамі ў мэтах падтрымання працэсу ляснох сертыфікацыі". Праект выконваецца пры падтрымцы галандскай прыродаахоўнай арганізацыі Ameco. На працягу 2009–10 гг. на тэрыторыі Глыбоцкага, Дзісненскага і Пружанскага лясгасаў былі праведзены даследаванні лясоў з высокай біялагічнай значнасцю – гэта значыць лясоў, якія захавалі ў сабе рысы першароднага лесу, не парушанага дзейнасцю чалавека (старыя дрэвы, вялікая колькасць буйной струхлелай валежнай драўніны, наяўнасць рэдкіх абарыгенных драўнінных парод, рэдкіх відаў раслін і жывёл і інш.).

Пасля правядзення палявых даследаванняў былі арганізаваны семінары з прыцягненнем спецыялістаў і мясцовых жыхароў, на якіх абмяркоўваліся пытанні аховы і вядзення гаспадаркі ў лясах з высокай біялагічнай значнасцю, улічваючы эканамічны, сацыяльны і экалагічны аспекты.



Палявы атлас-вызначальнік

Па выніках працы былі распрацаваны планы кіравання лясамі на тэрыторыі трох лясгасаў. Гэтыя планы ўключаюць апісанне каштоўных раслінных згуртаванняў, ацэнку пагроз іх існаванню, утрымліваюць мерапрыемствы па вядзенню гаспадаркі і праграмы доўгатэрміновага маніторынгу іх стану.

Адным з вынікаў праекта стала падрыхтоўка палявога атласа-вызначальніка "Ахоўваемыя лясныя віды раслін і жывёл Беларусі", у якім прадстаўлена большасць лёгка вызначальных лясных відаў, занесеных у Чырвоную кнігу РБ.

Максім Ярмохін, мэнэджар праекта

ЗАХАВАЕМ РАЗАМ

Шаноўныя чытачы!
У 2010 годзе АПБ выконвала некалькі праектаў, накіраваныя на стварэнне і развіцце сеткі захавальнікаў ТВП. Было арганізвана шмат розных мерапрыемстваў, галоўнай іх асаблівасцю стала тое, што захавальнікі на справе змаглі рэалізавацць свае памкненні ў захаванні прыроды. Матэрыялы пра найбольш цікавыя падзеі вы зможаце прачытаць ва ўкладцы "Захаваем разам".



The Coca-Cola Foundation

Праект "Стварэнне сеткі захавальнікаў ключавых водна-балотных угоддзяў у Беларусі" фінансуецца фондам Coca cola Foundation

Захавальнікі Выганашчанскіх балот

У лістападзе ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" рэалізавала ініцыятыву "Захавальнікі Выганашчанскіх балот" (праект ЕС/ПРААН "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні"), мэтай якой было стварэнне руху захавальнікаў у Выганашчанскім рэгіёне. Нягледзячы на кароткі тэрмін выканання, ініцыятыва была насычана мерапрыемствамі і мела канкрэтныя вынікі.

Каб знайсці захавальнікаў з ліку жыхароў рэгіёна, былі праведзены сустрэчы ў населеных пунктах: Выганашчы, Целеханы, Рэчкі, Вялікая Гаць, Амельная. Сустрэчы выклікалі цікавасць у амаль 200 чалавек, сярод іх было шмат вучняў, якія змогуць падзяліцца набытымі ведамі з бацькамі і сябрамі. Галоўнай мэтай сустрэч было паказаць вядомы ўдзельнікам край з незнаёмага боку – з боку каштоўнасці Выганашчанскіх балот для біяразнастайнасці. Супрацоўнікі АПБ падрабязна распавялі пра праграму "Тэрыторыі, важныя для птушак (ТВП) у Беларусі" і праект "Захавальнікі Выганашчанскіх балот", значнасць рэгіёна для захавання папуляцый рэдкіх птушак.

Асаблівы рэзананс мела інфармацыя пра адказнаць за браканьерства ў дачыненні да любога віда драпежных птушак. Так, згодна ўказу Прэзідэнта РБ № 580 ад 08.12.2005 і палажэнню канвенцыі CITES, штраф за здабычу звычайнага віда драпежнай птушкі, напрыклад, канюка, складае 2 100 000 рублёў, а за здабыццё занесенага ў Чырвоную кнігу віда, напрыклад, барадатай кугакаўкі, – 3 150 000 рублёў. Знішчэнне гнязда чорнага бусла з 4 яйкамі ці птушанятамі абыдзецца злачынцам амаль у 6 млн рублёў. Супрацоўнікі заказніка "Выганашчанскі" пазнаёмілі з дзейнасцю заказніка і мерамі па яго ахове.

Для тых, хто захацеў стаць захавальнікамі Выганашчанскіх балот, быў арганізаваны трэнінг, куды былі запрошаны эксперты па экалагічнаму заканадаўству, міжнароднай лясной сертыфікацыі FSC. Супрацоўнікі АПБ паказалі дзейнасць захавальнікаў іншых ТВП Беларусі і разам з удзельнікамі абмеркавалі існуючыя ў рэгіёне пагрозы і праблемы ТВП "Выганашчанскія балоты".

Самым цікавым мерапрыемствам, безумоўна, стаў семінар-трэнінг па лозапляценню і вырабу штучных гнездавых скрынь для драпежных птушак. Пры дапамозе запрошанага майстра прысутныя змаглі засвоіць методыку пляцення з лазы і паспрабаваць зрабіць штучнае гняздоўе ў выглядзе



Вынік семінара-трэнінга – 20 штучных гнёзд.



Галінка за галінкай – і новая "кватэра" для барадатай кугакаўкі будзе гатова.

каша для розных відаў соў. У плеценых кашах змогуць гнездавацца барадатыя кугакаўкі і вушастыя совы, якія не ўмеюць самі рабіць гнёзды. Незвычайныя з выгляду "кватэры" лёгка падняць на дрэва, а дзякуючы пляцёнцы, яны падобныя на сапраўдныя гнёзды. Таксама ў іх не будзе застойвацца вада.

Пакуль адны ўдзельнікі вучыліся рабіць гнездавыя кашы, іншыя засвойвалі навыкі будаўнікоў гнездавых скрынь для птушак, якія гняздуюцца ў дуплах. Кожны змог выбраць тып і зрабіць домік для сыча-сіпеля ці касматаногага сыча, гогаля, сокала-пустальгі. Вынікі працоўнага дня аказаліся плённымі: было выраблена 20 штучных гнёздаў і кашоў, асаблівую стараннасць праявілі вучні Рэчаўскай і Вулька-Целеханскай школы пад кіраўніцтвам настаўнікаў Фёдара Сауціна і Аляксандра Мяліка.

Вырабленыя падчас семінара штучныя гнёзды былі развешаны супрацоўнікамі АПБ і заказніка. Будзем чакаць улазінаў разам!

Вольга Лукшыц, спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях
Фота аўтара

Сустрэча на Сярэдняй Прыпяці

14 лістапада ў Лунінцы прайшла сустрэча, арганізаваная для захавальнікаў ТВП "Сярэдняя Прыпяць". Яе мэта – падвядзенне вынікаў працы па праекце за вясново-летні сезон 2010 года.



Знаёмства з маршрутам

У час прэзентацыі-справаздачы было адзначана, што хоць праект і стартаваў сёлета і праца па ім вялася толькі каля паўгода, праведзена пэўная работа па стварэнню сеткі захавальнікаў ТВП "Сярэдняя Прыпяць" і па арганізацыі іх дзейнасці. Дасягненнем можна лічыць тое, што на заклік стаць захавальнікам адгукнуліся 16 чалавек. Гэта людзі рознага ўзросту (ад 16 да 70 гадоў) і розных заняткаў.

За гэты час у рамках праекта ў супрацоўніцтве з дырэкцыяй заказніка "Сярэдняя Прыпяць" выраблены і развешаны гнездавыя скрыні для белай сініцы і сівагракa, праведзены ўлікі вяртлявай чаратоўкі і драча, зроблены ўлікі белага бусла ў вёсках, прылягаючых да заказніка, арганізаваны экскурсіі па Прыпяці для дарослых і школьнікаў.



Цяжкі шлях да калоніі чапель і бакланаў

Цэнтральнай жа падзеяй стаў летні палявы семінар, на якім асвятляліся пытанні, звязаныя з дзейнасцю захавальнікаў на тэрыторыі заказніка "Сярэдняя Прыпяць".

У першы дзень семінара перад захавальнікамі ТВП "Сярэдняя Прыпяць" з паведамленнем аб ТВП у Беларусі і дзейнасці захавальнікаў у іншых рэгіёнах выступіла каардынатар праекта Вольга Лукшыц. Супрацоўнік НПЦ па біярэсурсах Ірына Самусенка прадставіла прэзентацыю аб калоніі чапель і бакланаў у вусці Лані і аб ходзе кампаніі па падліках белага і чорнага буслоў. Юрыст па пытаннях экалагічнага права Рыгор Фёдараў пазнаёміў удзельнікаў семінара з юрыдычнымі асаблівасцямі ахоўваемых тэрыторый Беларусі і статусе грамадскага інспектара аховы прыроды.

Падчас сустрэчы захавальнікі не толькі азнаёміліся з тэрыторыяй заказніка, але вучыліся вызначаць птушак, абменьваліся вопытам назіранняў ў прыродзе. Асабліва цікавым было наведванне калоніі чапель і бакланаў у вусці Лані. Калонія нікога не пакінула абыякавым, нягледзячы на ўсе цяжкасці, выкліканыя анамальна высокім узроўнем вады ў гэтым годзе, якія прыйшлося пераадолець на шляху да яе.

Некалькі дзён семінара пакінулі добрыя ўражанні ад сустрэчы аднадумцаў і выклікалі яшчэ большае жаданне зрабіць свой унёсак у захаванне унікальнага куточка Беларускага Палесся.

Анатоль Нефідовіч, рэгіянальны каардынатар "Сярэдняя Прыпяць".
Фота аўтара

Птиц считаем в январе

Зима – трудный период в жизни птиц. Некоторые из них, не желая бороться с холодом и голодом, направляются на юг, в далекое и трудное путешествие, чтобы в более мягких условиях пережить зиму. Другие виды остаются в тех местах, где появились на свет. Отчасти благодаря тому, что значительная часть птиц улетела, те виды, которые остались на зимовку, могут собрать нужное количество корма и выжить. Кроме того, некоторые виды птиц прилетают к нам на зимовку из северных регионов. Наиболее массовые из них – обыкновенная чечетка и свиристель.

Приспосабливаясь к суровым условиям, многие птицы объединяются в стаи и летят ближе к жилью человека. Чаще, чем летом, можно наблюдать различные виды синиц, а также обыкновенных зеленушек, снегирей, чижей. Вслед за мелкими птицами летят в города и хищные птицы. Обычное дело увидеть там ястребов – тетеревятника и перепелятника. Последний частенько прилетает на кормушки, чтобы поймать какую-либо синичку или воробья.

Учитывая стайность птиц, их заметность и стремление зимовать в населенных пунктах и их окрестностях, зима становится удобным периодом для наблюдений за ними. Это хорошее время для тех, кто хочет научиться распознавать птиц в природе. Более того, еще проще понаблюдать за птицами привлекая их на кормушки. При умелом подходе на кормушке можно прикормить более 10 видов птиц. Для того, чтобы можно было организованно понаблюдать за птицами на протяжении всего января, АПБ проводит национальные зимние учеты птиц. Ежегодно в январе все желающие учитывают птиц в саду, парке, сквере и других местах, где живут птицы. Сообщая в АПБ данные о своих наблюдениях, дети и взрослые присоединяются к массовому экологическому мероприятию республиканского масштаба. Более того, среди участников АПБ традиционно разыгрывает полевые бинокли и определители птиц.

Для участия в учетах используйте анкету, которая прилагается к бюллетеню.

Руслан Шайкин, специалист по экологическому образованию



Лазоревка обыкновенная, или синяя синица. Можно спутать с синицей большой. Отличается бело-голубой «шапочкой», голубыми крыльями и хвостом.



Синица большая. Можно спутать с лазоревкой обыкновенной. Хорошо отличается по черной голове с белыми щеками и черной полосе, идущей по середине груди и живота.



Синица хохлатая. Вид прекрасно отличим от других синиц большим хохолком на голове. Редко встречается в населенных пунктах. Довольно обычный вид в хвойных лесах.



Московка. Можно спутать с синицей большой по белым щекам. Отличается от последней меньшим размером и белым затылочным пятном. Редко встречается в населенных пунктах. Довольно обычно – в хвойных лесах.



Галка. Наиболее мелкая из черных врановых Беларуси. Хорошо отличается от других врановых серыми боками и затылком головы. Глаза светлые, ярко выделяющиеся. Часто образует стаи вместе с грачами.



Грач. Чаще всего называют вороной. Реально же от серой вороны отличается однотонной черной, с фиолетовым отливом, окраской. От ворона отличается более тонким, плоским клювом. Образует стаи. ВорОны и вОроны совместные стаи образуют редко!



Серая ворона. Все белорусские вороны хорошо отличимы от других врановых птиц! Имеет серый живот и спину; голова, грудь, крылья и хвост черные.



Ворон. Можно спутать с грачом. Отличается от последнего более крупным размером, мощным клювом и клиновидным хвостом. Редко встречается в населенных пунктах, но в целом обычный вид. Не МУЖ вороны! :))




Воробей полевой. Можно спутать с воробьем домовым. Имеет полностью коричневую шапочку и черное пятно на щеке.





Воробей домовый. Можно спутать с воробьем полевым. Самцы и самки различаются по окраске головы; у самки – отсутствует черный «галстук». Самцы имеют серую шапочку, щечки без черного пятна.



Снегирь. Хорошо отличимая и знакомая многим птица. У самца ярко-красная грудь. У самки грудь светло-серо-коричневая.



Поползень. Верх тела серо-голубой, низ белый, бока рыжие. Через глаз идет черная полоса. Зачастую его можно наблюдать передвигающимся по стволу дерева вниз головой.



Зеленушка. Окраска оливково-зеленая, самки более серые. На крыльях и хвосте хорошо заметны желтые пятна.



Обыкновенная овсянка. У самца желтая голова и низ тела. Спина и бока с коричневыми пятнами. У самок меньше желтого цвета и больше пятен. Надхвостье каштановое, хвост коричневый с белыми краями.



Дубонос. Хорошо отличимая птица. Коричневая (разных оттенков) с белой полосой на черно-гранатовых крыльях и белым концом хвоста. Имеет массивный серо-голубого цвета клюв.




Голубь сизый. Типичный синантропный вид. Далеко от населенных пунктов не встречается. Может быть различных цветовых окрасов (белых, коричневых, серых, черных). Обычно образует стаи. Наиболее приближенный к дикому окрасу голубь, так как имеет общий серый окрас, две черные поперечные полосы на крыльях и белое надхвостье.



Горлица кольчатая. Встречается в населенных пунктах. Имеет общий серо-пепельный окрас и черную полосу на шее, за которую птица и получила свое название. Хорошо определяется по голосу. Запись голоса можно попросить в офисе АПБ.



Гаичка буроголовая. Тяжело отличима от гаички черноголовой. Различается от последней большим по размерам черным горловым пятном, светлым пятном на сложенных крыльях и голосом. Запись голоса можно попросить в офисе АПБ. Редко встречается в населенных пунктах. Довольно обычно – в лесах.



Гаичка черноголовая. Тяжело отличима от гаички буроголовой. Имеет меньшее по размерам горловое пятно. Отличается по голосу. Запись голоса можно попросить в офисе АПБ. Редко встречается в населенных пунктах. Довольно обычно – в лесах.



Сойка. Перед тела и спина коричнево-рыжие. На крыльях белое и голубое с черными полосками «зеркальца». В полете хорошо видно белое надхвостье. У основания клюва черные усы.



Свиристель. Серо-коричневая птица с большим хохолком. На конце хвоста желто-черная полоса, а на крыльях бело-красное «зеркальце».

Составители Денис Кител‌ь и Семен Левый. Иллюстрации взяты из определителя Collins Bird Guide

Людзі на балоце...

Удзел ва ўліках вяртлявай чаротаўкі пакідае яркія і незвычайныя ўражанні. Праз нейкі час усе адчуванні, якія перажыў, блукаючы па балотах, вярнуліся з новай сілай, захлынулі ўспаміны. Балотныя сцяжынкі, спяванне і крык птушак, людзі, бесхрыбетная драбяза, што лезе ў вочы і вушы – усё ўспамінаецца, добрае ці не вельмі. Радуе, што ў гэтым годзе пасільны ўдзел ва ўліках узялі і захавальнікі некалькіх тэрыторый.



Палявы семінар перад улікамі



Захавальнікі ўлічваюць вяртлявую чаротаўку

Стартавалі улікі-2010 на ТВП "Балота Званец" у траўні. Як звычайна, улікі прайшлі з міжнародным рэзанансам: акрамя нашых, у іх прынялі ўдзел і замежныя госці – з Польшчы, Германіі, Нідэрландаў.

Званец, бясспрэчна, адна з найбольш складаных тэрыторый для ўлікаў, дзе важна добра арыентавацца на мясцовасці, як пры іх правядзенні, так і ў арганізацыі пабытавых пытанняў. Вельмі вялікая арганізацыйная дапамога была аказана якраз захавальнікамі: парады, дзе лепш пасяліцца, як лепш дабрацца, аказваліся часам проста неацэннымі.

ТВП "Сэрвач" – гэта самая паўночная кропка гнездавання вяртлявай чаротаўкі ў Беларусі. У чэрвені ўлікі праводзіліся і тут. Удзел у іх прынялі і захавальнікі ТВП "Сэрвач". На працягу трох вечароў па нізіннаму балоту вакол возера Сэрвач прабіраліся арнітолагі і захавальнікі, каб не прапусціць ні адзін голас спяваючай вяртлявай чаротаўкі. Ва ўліках найбольш актыўны ўдзел прынялі 5 захавальнікаў – з г. Глыбокае і в. Дзеркаўшчына – ад вучня адзінаццатага класа да пенсіянера. Некалькі захавальнікаў не змаглі асабіста прыняць удзел ва ўліках, але дапамаглі ў іх правядзенні – прадаставілі човен для заплыву на дальнюю кропку і падказалі, як лепш абыходзіць балота.

Падчас улікаў усе ўдзельнікі змаглі ўбачыць вяртлявую чаротаўку, а таксама даведаліся, як крычаць пагоніч, пастушок, вялікая выпь, звычайны чаромашнік. У выніку чаротаўка была палічана, усе ўдзельнікі шчаслiва вярнуліся дамоў і ні адзін прадмет абсталявання не быў згублены або "патоплены".

Акрамя ўлікаў вяртлявай чаротаўкі, захавальнікі Званца аказалі арнітолагам неацэнную дапамогу ў біятэхнічных мерапрыемствах. Вясной і восенню ў ваколіцах Званца было развешана амаль паўтара дзесяткі разнастайных "птушыных кватэр".

Звычайна падобная праца зацягваецца на некалькі дзён. Неабходна агледзець біятопы, абраць патрэбнае дрэва, данесці гняздоўе і інструмент да месца і толькі тады прыступаць да працы. Праца заняла менш часу, дзякуючы таму, што захавальнікі Міхаіл Краўчук і Леанід Каўтунчык ведалі Званец з дзяцінства і арыентаваліся ў лесе. Кожная сцяжынка таіла ў іх памяці разнастайныя ўспаміны, якімі яны ахвотна дзяліліся. Неацэнную дапамогу аказаў і Міхаіл, які праводзіў па разбітым і затопленым сцяжынам у лесе свой воз, запрэжаны конем і загружаны домікамі для сычоў. Дзякуючы яму, мы хутка вызначыліся з месцам лакалізацыі. Многія гнёзды, напрыклад, для пустальгі і вушастай савы, былі вывешаны ў месцах, дзе захавальнікам будзе лёгка іх кантраляваць і ў час інфармаваць арнітолагаў пра знаходкі. Чакаем навасёлаў і да сустрэчы на балоце!

Алег Кальчанка, рэгіянальны каардынатар сеткі захавальнікаў ТВП "Балота Званец", г. Кобрын
Вольга Лукшыц, каардынатар праекта
Дзяніс Кіцель, спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях
Фота В.Лукшыц

Усталяваны інфармацыйныя стэнды на ТВП "Балота "Ельня", "Сэрвач", "Налібоцкая пушча"



Супрацоўнікі Валакацкага лясніцтва пасля ўсталявання стэнду



Інфармацыйны стэнд "Ельня" у г.Міёры

Кожны з нас, наведваючы тэрыторыі, важныя для птушак (ТВП) "Сэрвач", "Балота Ельня", "Налібоцкая пушча", зможа зараз не толькі ўбачыць унікальныя ландшафты, але і даведацца пра іх трошкі больш, дзякуючы ўстаноўленым аншлагам і інфармацыйным стэндам. З канца лета да сярэдзіны восені на згаданых тэрыторых у межах праекта ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (АПБ) "Стварэнне сеткі захавальнікаў вакол ключавых водна-балотных угоддзяў у Беларусі" вялася іх устаноўка.

Зараз наўрад ці можна здзейсніць паход на рыбалку або выправіцца на збор ягад, не даведаўшыся, што заказнік "Сэрвач" уключаны ў міжнародную сетку ТВП. Аншлагі з лагатыпам ТВП, што паведамляюць пра статус тэрыторыі, былі расстаўлены па межах ТВП "Сэрвач" яшчэ ў жніўні.

Неацэнную дапамогу ў іх усталяванні аказала ДЛГУ "Бягомльскі лясгас", а ў прыватнасці супрацоўнікі Валакалацкага лясніцтва, якое знаходзіцца ў паўднёвай частцы заказніка. На яго тэрыторыі былі ўстаноўлены 3 з 5-ці аншлагаў. На паўночным беразе возера Сэрвач супрацоўнікамі Докшыцкага ПМС быў усталяваны яшчэ адзін аншлаг. На жаль, у папулярным месцы адпачынку, размешчаным каля месцаў гнездавання вяртлявай чаротаўкі, аншлаг неўзабаве стаў ахвярай вандалаў.

Для ТВП "Налібоцкая пушча" і "Балота Ельня" былі выраблены вялікія інфармацыйныя стэнды. Акрамя памераў, яны прыцягваюць да сябе ўвагу ўнікальнымі фотаздымкамі малога падорліка і шэрага жорава, аўтарам якіх з'яўляецца Віктар Казлоўскі. Згаданыя віды птушак былі абраны не выпадкова: ТВП "Налібоцкая пушча" з'яўляецца адным з асноўных месцаў гнездавання малога падорліка ў Беларусі, а на ТВП "Балота Ельня" ў час міграцыі спыняюцца тысячы жураўоў. Стэнды ўтрымліваюць асноўную інфармацыю пра тэрыторыі і схемы гэтых тэрыторый. На стэндзе "Ельня" можна даведацца і пра гняздуючыя на балоце віды птушак, а ўсталяваны ён у г. Міёры.

Стэнд пра ТВП "Налібоцкая пушча" быў усталяваны супрацоўнікамі РУП "Белдзяржпаляванне" на ўездзе ў лясны масіў, які знаходзіцца на 87 км трасы Гродна–Мінск. Цяпер малы падорлік будзе сустракаць кожнага госця Налібоцкай пушчы.

Заключным акордам стане ўстаноўка стэнда "Ельня" ў г.п. Шаркаўшчына, дзе ён будзе ўстаноўлены ў цэнтры горада, дзякуючы Шаркаўшчынскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Вольга Лукшыц, каардынатар праекта. Фота аўтара

Захавальнікі ТВП "Балота Ельня" сталі грамадскімі інспектарамі аховы прыроды

Першыя грамадскія інспектары з шэрагу захавальнікаў з'явіліся ў ТВП "Балота Ельня" з Шаркаўшчынскага раёна, дзе ў пачатку лета пасведчанні атрымалі Валерый Кавалёнак, Яўген Ліпскі і Марына Фёдарава.



Уручэнне пасведчанняў грамадскага інспектара у Міёрскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

Яшчэ адзін крок для захавання балота Ельня быў зроблены 19 кастрычніка 2010 г. У Міёрскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя адбылося афіцыяльнае ўручэнне пасведчанняў захавальнікам Ельні з гэтага раёна – Аляксандру Кляшчонку, Касі Казачонак, Юрыю Якаўлеву, Наталлі Балаш.

Начальнік інспекцыі Ігар Мішута ўручыў пасведчанні і пажадаў грамадскім інспектарам поспехаў у захаванні прыроды раёна. Ён звярнуў увагу на тое, што, нягледзячы на грамадскі статус, інспектары валодаюць абавязкамі і правамі, карыстаючыся якімі можна эфектыўна дапамагаць працы раённай інспекцыі і садзейнічаць захаванню прыроды.

Напрыклад, грамадскія інспектары могуць прымаць удзел у праверках выканання патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства, стандартаў, норм і правіл у галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў; патрабаваць ад грамадзян тлумачэнняў з прычыны допушчаных імі парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства, прымаць меры па папярэджанню або спыненню парушэнняў заканадаўства ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

Каардынатар праекта АПБ па стварэнню сеткі захавальнікаў ТВП Вольга Лукшыц адзначыла, што важнай дзейнасцю грамадскіх інспектараў стане ўдзел у экалагічнай адукацыі і асвеце, а новы статус павысіць ролю захавальнікаў ТВП. Да таго ж, шэрагі інспектараў папаўняюцца і на іншых тэрыторыях – патэнцыяльныя інспектары з ліку захавальнікаў "Званца" падалі дакументы на разгляд.

Усе захавальнікі Ельні, што атрымалі пасведчанні, былі актыўнымі ўдзельнікамі валанцёрскіх работ на балоце Ельня па аднаўленню гідралагічнага рэжыму (некаторыя на працягу некалькіх гадоў), маніторынгу птушак і экалагічнай асвеце.

Вольга Лукшыц, каардынатар праекта. Фота аўтара

Климатический проект АПБ


Проект «Восстановление торфяников Беларуси и применение концепции их устойчивого управления – снижение воздействия на климат с эффектом для экономики и биоразнообразия» стартовал в декабре 2008 года. Его целью является восстановление более 15 000 га ранее осушенных болот, эффективное управление ими с эффектом для экономики и биоразнообразия, а также разработка схемы устойчивого финансирования проектов по заболачиванию с использованием возможностей и финансовых механизмов мирового углеродного рынка.











(начало читайте на стр.1)

И где это все происходит?

Беловежская Пуща – наиболее крупный массив реликтового леса. На территории национального парка установлены 4 автоматических датчика для измерения УГВ и проведено описание растительности. Во время их установки состоялась экстремальная встреча со стадом зубров на расстоянии 100 м, закончившаяся благополучно как для исследователей, так и для животных.

Полесский радиационно-экологический заповедник – интересное и уникальное место. В связи с трагедией, случившейся на ЧАЭС, в заповеднике можно наблюдать естественное заболачивание осушенных торфяников уже на протяжении более 20 лет (другого такого места нет в Европе), а также сукцессию (смену растительности) на заброшенных территориях.

Березинский биосферный заповедник славен красивой природой. На его территории находится болотный комплекс просачивающегося типа: торф настолько рыхлый, что грунтовые воды легко проходят между его слоями.

На Докудовском месторождении и в заказнике Споровский заложено несколько трансектов, которые показывают смену растительности от края болота к центру.

В заказнике Ельня три трансекта идут перпендикулярно осушительным каналам, и также иллюстрируют, как меняется состав растительности в зависимости от УГВ.

Заказник Званец – достаточно труднопроходимое болото низинного типа. Так как самая крупная популяция вертлявой камышевки встречается именно здесь, кроме изучения типов растительности, индицирующих УГВ, был исследован трансект в аспекте обитания этого редкого вида.

Также были исследованы торфяники Цна, Ухлава, Жаденовский Мох, Бартениха, Святое и заказник Озеры. Всего установлено 44 автоматических датчика, 54 МинМакс прибора, выполнено около 300 описаний растительности согласно мониторинговому протоколу. Работа ведется в тесном сотрудничестве со Здитовской СШ и экологическим центром в г. Борисове.

Кроме разработки модели для оценки эмиссий парниковых газов с торфяников, рабочая группа занимается поиском территорий для вторичного заболачивания.

А почему в Беларуси?

Беларусь находится в центре Европы и, во-первых, болота занимают значительную ее часть (14.2% от всей территории), во-вторых, болота здесь представлены разными типами – низинные, верховые, переходные – и в более или менее естественном состоянии находится около 50% болот.

И это гордость для нашей республики – стать первой страной, которая может торговать CO2-сертификатами, полученными при восстановлении нарушенных болот, а предложенная методика может быть использована другими странами со сходными климатическими условиями.

Анет Тиле, Надежда Лещинская, специалисты АПБ

В Беларуси прошел международный семинар по восстановлению болот

С 9 по 11 сентября 2010 г. близ болота «Островское» в Миорском районе Витебской области прошел научно-практический семинар «Гидрологические принципы и подходы к планированию восстановления верховых болот». Это первый из двух семинаров, посвященных восстановлению нарушенных торфяников, проводимый АПБ в рамках проекта.



Обсуждение проекта повторного заболачивания болота «Островское»

В семинаре приняло участие свыше 25 человек из Германии и Беларуси. На нем были затронуты вопросы гидравлики, изменения рельефа и вегетации, зависимости растительности и баланса парниковых газов от уровня воды, желательные результаты восстановления для биоразнообразия, возможность использования результатов наблюдений метеостанций и гидрологических постов в Миорском районе, а также рассмотрен предварительный план восстановления болота Островское.

На болоте «Островское» практически ежегодно возникают торфяные пожары. Для их ликвидации регулярно привлекаются значительные финансовые средства лесхоза. Поэтому заболачивание данного торфяника очень своевременно.

Как отметил Виктор Фенчук, директор АПБ, данный проект является пилотным, и при его успешном воплощении на таком небольшом торфянике как «Островское» (около 780 га), апробированные методики можно будет применять и на других проектных территориях.

Проведение следующего семинара планируется в 2011 году, и он будет направлен на решение практических задач восстановления торфяника «Островское».

Екатерина Евсюкова
Фото из фототеки АПБ

Делая выбор

Специалисты АПБ посетили семинар "Делая выбор: использование сокращений выбросов парниковых газов в ходе заболачивания торфяников в Восточной Европе", который проходил с 23 по 27 октября 2010 г. на острове Вилм, Германия.

Данный семинар был направлен на обмен этическими, политическими, стратегическими, научными и техническими аспектами в управлении восстановленными торфяниками для смягчения последствий изменения климата и последующей торговли сокращениями выбросов, полученных в результате их заболачивания.

Были рассмотрены требования к получению сокращений, новые возможности по разработке добровольного углеродного стандарта и другие вопросы.

Во время семинара состоялась экскурсия на площадки, где сотрудники Leibniz Centre for Agricultural Landscape Research (Лейбницкий центр исследований сельскохозяйственных ландшафтов) проводят измерения баланса эмиссии парниковых газов. Профессор Юрген Августин продемонстрировал оборудование для измерения ПГ (данная методика используется и в Беларуси), а также рассказал про принципы работы башни Эдди, которая измеряет эмиссии ПГ в радиусе около 30 м. Позже был посещен участок в долине реки Пина, где производится кошение тростника с целью получения подходящего места обитания для вертлявой камышевки.



Андрей Бурло, специалист АПБ, рассказывает о методике измерения парниковых газов. Фото И.Войтехович

Анна Чувашова и Надежда Лещинская, специалисты АПБ



Болота. Необычное

В рамках проекта АПБ подготовила фотовыставку "Болота. Необычное", на которой представлены работы белорусских фотографов Сергея Колтовича и Алексея Осиповича, сделанные в заказнике "Споровский", на восстановленных болотах "Гричино-Старобинское", "Бартениха", в Березинском биосферном заповеднике и в Беловежской пуще. Данная выставка имеет целью не только показать завораживающую, пленительную красоту, неподражаемую яркость и разнообразие белорусских болот, но и еще раз подчеркнуть незаменимость и масштабность биосферных функций естественных болотных экосистем.

В течение следующего года выставка будет демонстрироваться в различных публичных местах Минска и других городов Беларуси. Если вы заинтересованы показать выставку в вашем городе – обращайтесь в секретариат АПБ.

Фото Сергея Колтовича

“Заалагічныя чацвяргі” сезона 2010-2011

14 кастрычніка пачаўся новы сезон “Заалагічных чацвяргоў” – сустрэч аматараў птушак, прыроды і падарожжаў. Сёлета нашы сябры наведалі многія далёкія краіны: Індыя, Узбекістан, Казахстан, Кіпр, Швецыя і гатовы падзяліцца сваімі ўражаннямі пра паездкі.

На сённяшні дзень ужо адбыліся 3 сустрэчы, пра якія вы можаце пачытаць (і паглядзець іх прэзентацыі) на галоўнай старонцы сайта www.bitdwatch.by у раздзеле “Навіны”. Назвы артыкулаў: “Распачаўся сезон заалагічных чацвяргоў”, “У чым сакрэты майстроў фотаанімалістыкі?”, “Прырода далёкага Узбекістана”.

Усіх ахвотных запрашаем далучыцца да нас на наступных сустрэчах:

13 студзеня – Вялікі арлец: вынікі сезона 2010. Валерый Дамброўскі.

У пошуках джэка. Ад узбекскіх кызылкумаў да казахскіх каракумаў. Прырода, птушкі, людзі. Эдуард Монгін, Алег Астроўскі, Максім Тарантовіч.

10 лютага – Барацьба з вясновым паляваннем на птушак у краінах Міжземнамор'я. Юра Бакур.

10 сакавіка – Падарожжа ў краіну вікінгаў. Яўген Сліж.



Каўказскі тур. Фота В. Лукшыц

14 красавіка – Жыццё вышэй за 2 000 метраў над узроўнем мора. Вольга Лукшыц.

Заалагічныя чацвяргі праходзяць у Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва (вул. Макаёнка 8, г. Мінск). Пачатак сустрэч у 17:30. Уваход вольны.

Приглашение для любителей фотоохоты



Орлан-белохвост. Фото Н.Воробья

В рамках проекта «Акция для Орлов и Людей. Сохранение редких птиц Выгонощанского региона силами общественности», финансируемого программой малых грантов посольства США в Республике Беларусь с января по март 2011 года будут проводиться семинары-фотопленэры на территории ТВП «Выгонощанское».

Объектами «охоты» станут редкие хищные птицы – орланы белохвосты, бородатые неясыти, а так же другие виды птиц или зверей. По итогам фотопленэров будет организована передвижная некомерчиская фотовыставка, которая познакомит жителей региона с удивительным животным миром Выгонощанских болот.

К участию приглашаются как профессиональные фотографы-анималисты, так и любители. Расходы участников (проезд, проживание, питание) будет оплачиваться из бюджета проекта. Участники должны владеть необходимой техникой для съемки живой природы, по возможности засидками, а так же предоставить фотографии (если удастся сделать удачные кадры) для организации некоммерческой фотовыставки. Членство участников в АПБ приветствуется.

Узнать даты проведения фотопленэров, а так же задать вопросы по организации можно у координатора проекта Ольги Лукшиц: тел. 8-017-263-06-13 (секретариат), 8-029-384-61-22 (мобильный), lukshyts@ptushki.org.

Шумоизоляционные щиты – опасность для птиц!

Для уменьшения шумового эффекта и воздействия выхлопных газов в населенных пунктах Беларуси на часто используемых автодорогах устанавливаются шумоизоляционные щиты. Такие сооружения зачастую снабжаются стеклянными панелями. Ничего похожего на стекло в природе не существует, поэтому любая стеклянная поверхность – это потенциально опасная ловушка для птиц, и им трудно научиться избегать этого «врага».

В сентябре 2010 г. сотрудниками АПБ была проведена оценка влияния шумоизоляционных щитов на птиц в окрестностях д. Сеница Минского района. В результате обследования за короткое время выявлены 12 жертв.

Для предотвращения гибели достаточно наклеить на стекло силуэты хищных птиц в натуральную величину. Это является достаточно дешевым и эффективным способом. Он используется в Западной Европе вот уже на протяжении нескольких десятков лет.

В адрес РУП «Минскавтодор-Центр» от АПБ было направлено письмо с предложением последовать мировой практике и нанести на стеклянные панели шумоизоляционных щитов в д. Сеница Минского района силуэты хищных птиц. Предприятие активно поддержало инициативу, и в ноябре силуэты были наклеены.

Для решения проблемы в целом по Беларуси, АПБ написала письмо в Минприроды с просьбой поддержать инициативу и направить письма с предложением нанести силуэты хищных птиц на стекла шумоизоляционных экранов в организации и предприятия, в ведении которых находятся такие щиты, в свою очередь предложив консультационно-методическую помощь. В ответ Минприроды инициировало рассмотрение затронутой проблемы на уровне областных и Минского городского комитетов природных ресурсов и охраны окружающей среды.

Денис Кител ь, специалист АПБ по природоохранным вопросам





Варианты силуэтов хищных птиц, которые наклеиваются на стеклянные поверхности экранов

Вялікія выбары ў 2011

У гэтым годзе скончацца паўнамоцтвы шэрагу сябраў выбарных органаў АПБ: Старшыні АПБ, Уладзіміра Іваноўскага, шасці сябраў Цэнтральнага Савета (Дз. Вінчэўскі, Н. Карліонава, М. Нікіфараў, Н. Парэчына, П. Пінчук, В. Пракапчук) і ўсіх сябраў Рэвізійнай камісіі (В. Грычык, Г. Міндлін, М. Чэркас). Выбары на гэтыя пасады адбудуцца на чарговым З'ездзе АПБ, які пройдзе ў Мінску 29 студзеня 2011 года.

Нагадаем, што вышэйшым органам АПБ з'яўляецца З'езд, які склікаецца адзін раз у кожны каляндарны год. У перыяд паміж З'ездамі працай АПБ кіруе Цэнтральны Савет, які складаецца з 8 сябраў і Старшыні. Старшыня АПБ з'яўляецца вышэйшай службовай асобай АПБ і адначасова старшынёй Цэнтральнага Савету. Рэвізійная камісія з'яўляецца кантрольным органам АПБ і абіраецца З'ездам.

Цэнтральны Савет сваім рашэннем ад 21 снежня 2010 г. вылучыў кандыдатамі на пасаду Старшыні АПБ А. Вінчэўскага і В. Грычыка. Кандыдатамі на пасады сябраў ЦС вылучаны: В. Гуменны, У. Іваноўскі, Н. Карліонава, М. Нікіфараў, Н. Парэчына, В. Пракапчук, І. Самусенка, М. Чэркас, а таксама ў выпадку неабрання на пасаду Старшыні АПБ – А. Вінчэўскі, В. Грычык. Кандыдатамі на пасады сябраў Рэвізійнай камісіі вылучаны Дз. Вінчэўскі, А. Кальчанка, Г. Міндлін.

Згодна п.4.8. Статута АПБ кандыдатуры Старшыні АПБ, сябраў ЦС і Рэвізійнай камісіі таксама могуць быць вылучаны не менш чым 10 сябрамі АПБ, якія маюць актыўнае выбарчае права*. У гэтым выпадку намінацыі на гэтыя пасады з боку сябраў АПБ павінны быць атрыманы Сакратарыятам не пазней за 27 студзеня 2011 года, каб падрыхтаваць працэдуру галасавання.

* Актыўнага выбарчага права не маюць асобы, якія не дасягнулі 16 гадоў, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства.


Ахова птушак Бацькаўшчыны
ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ
№ 3(42) - 2010

BirdLife International PARTNER
www.ptushki.org

АПБ з'яўляецца эксклюзіўным партнёрам BirdLife International у Беларусі

(с) АПБ, 2010 Інфармацыйны бюлетэнь ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”,

Галоўны рэдактар: Фянчук Віктар Аляксандравіч
Рэдакцыйная рада: Вінчэўскі Аляксандр Яўгенавіч, Вінчэўскі Дзьмітрый Яўгенавіч, Самусенка Ірына Эдуардаўна, Чэркас Мікалай Данілавіч
Верстка: Гупянец Зміцер

“ №4, 2010 год ”
Рэгістрацыйны №2714 ад 27.06.2008 г. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Наш адрас: ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”, вул.Макаёнка, 8-313, 220114, Мінск Беларусь
Тэл. (017) 263 01 30, Факс (017) 263 06 13
E-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org

Для карэспандэнцыі
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь

Дзейнасць ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны” падтрымліваецца Каралеўскім Таварыствам Абароны Птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі. ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны” з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком BirdLife International у Беларусі.

Надрукавана ў друкарні УП “Данарыт”.
Ліцэнзія ЛП № 02330/0494183 ад 03.04.2009.
Наклад 1100 паас.
Передрук дазваляецца пры ўмове спасылкі на “Інфармацыйны бюлетэнь”
Замова № 13035.